*Д.І.Палавеня*

# ФАКТАРЫ СТАБІЛЬНАСЦІ МАЛАДОЙ СЯМ'І Ў ПРАЦЭСЕ САМАРЭАЛІЗАЦЫІ

Маладая сям'я з'яўляецца свайго роду групай рызыкі, бо менавіта ў ёй пачынаюць фарміравацца агульная канцэпцыя далейшага яе існавання і магчымасці самарэалізацыі як сацыяльнай групы. Сям'я ў гэты перыяд праходзіць першасную адаптацыю (як унутраную, так і знешнюю), фарміруе сістэму сямейных каштоўнасцей і патрэб, будуе планы на будучыню і інш. Такім чынам, калі дапусціць магчымасць самарэалізацыі маладой сям'і, то адзначаныя вышэй працэсы з'яўляюцца асноўнымі, ад якіх шмат у чым залежыць стабільнасць яе існавання.

На думку сучасных даследчыкаў, для стварэння моцнага шлюбу патрэбныя:

1) маральныя і асабістыя якасці маладых людзей, якія забяспечваюць працэс адаптацыі ў першыя гады шлюбу;

2) сумяшчальнасць мужа і жонкі па псіхалагічных, маральных, сексуальных, ідэалагічных і іншых параметрах. Трэба адзначыць, што паняцце сумяшчальнасці, якое сведчыць пра стабільнасць сямейна-шлюбных адносін, можа таксама ўключаць абсалютную рознасць мужа і жонкі. Гэта адбываецца ў тых выпадках, калі перавага пэўных рыс у аднаго з членаў сям'і кампенсуе іх недахоп у другога;

3) аб'ектыўна неабходныя ўмовы жыцця (жыллёвыя, матэрыяльныя і інш.).

Прычынамі канфліктаў і распаду сямейна-шлюбных адносін могуць быць псіхалагічная і практычная непадрыхтаванасць моладзі да стварэння сям'і, адсутнасць адпаведных ведаў і ўменняў:

– па доглядзе і выхаванні дзяцей;
– у сферы сямейнага ўзаемадзеяння;
– у сферы інтымных адносін;
– па рацыянальным вядзенні гаспадаркі;
– па арганізацыі і правядзенні вольнага часу і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Таму падрыхтоўка да будучага сямейнага жыцця – гэта своеасаблівая школа фарміравання асобы і яе самарэалізацыі.

Такім чынам, адным з галоўных фактараў стабільнасці сямейна-шлюбных адносін з'яўляецца ступень падрыхтаванасці будучых мужа і жонкі, куды мы ўключаем:

– узровень самарэалізацыі асобы на дадзеным этапе, бо сям'я не павінна быць перашкодай на шляху самарэалізацыі асобы;

– наяўнасць ведаў і ўменняў, неабходных у сямейным жыцці.

Вялікае значэнне ступені падрыхтаванасці да стварэння сям'і пацвярджае і той факт, што па выніках даследаванняў, якія праводзіліся ў Рэспубліцы Беларусь, найбольш стабільнымі з'яўляюцца сем'і, якія стварыліся пасля паўторнага шлюбу. Растлумачыць гэта можна наяўнасцю вопыту, набытага мужам і жонкай у першым шлюбе.

Моцны ўплыў на стабільнасць і развіццё сямейна-шлюбных адносін аказваюць, на наш погляд, наступныя фактары.

1. Матэрыяльная забяспечанасць сям'і, якая прадугледжвае не толькі наяўнасць сродкаў існавання, але і псіхалагічную падрыхтаванасць да эканамічнай самастойнасці, накіраванасць на стварэнне матэрыяльнай базы сям'і, уменні рацыянальна планаваць і размяркоўваць сямейны бюджэт.

2. Арганізацыя быту сям'і, дзе важную ролю адыгрывае не роўнае, а справядлівае размеркаванне хатніх абавязкаў, гэта значыць з улікам занятасці кожнага члена сям'і на рабоце, наяўнасці вольнага часу, схільнасці да выканання таго ці іншага віду работ і жадання аказваць адзін аднаму дапамогу ва ўсіх сферах жыццядзейнасці.

3. Структура, формы і запоўненасць правядзення вольнага часу, дзе важную ролю адыгрывае суадноснасць развіцця патрэб членаў сям'і з яе магчымасцямі.

4. Сфера ўзаемаадносін, якая ўключае:

– сумяшчальнасць (як псіхалагічную, так і фізіялагічную);

– каханне;

– каштоўнасці, патрэбы, погляды, інтарэсы і іх суадноснасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Трэба адзначыць, што сфера ўзаемаадносін з'яўляецца скразной сярод вышэйадзначаных фактараў стабільнасці сямейна-шлюбных адносін. Яна ўплывае і на іншыя фактары.

5. Працэс самарэалізацыі – самарэалізацыя сям'і як групы, самарэалізацыя кожнага з членаў сям'і як асобы, самарэалізацыя членаў сям'і ў сям'і.

Усе пералічаныя фактары стабільнасці сямейна-шлюбных адносін узаемна ўплываюць адзін на аднаго, што з'яўляецца значнай умовай у станаўленні і развіцці маладой сям'і. Пры творчым падыходзе да вырашэння праблем, якія ўзнікаюць у адзначаных сферах, і праяўленні творчых патэнцый членаў маладой сям'і такое развіццё абяцае быць паспяховым.

*С.А.Пацыенка*

## АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ КУЛЬТУРЫ ВЫШЭЙШАГА САСЛОЎЯ Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ

Вышэйшае саслоўе ў Вялікім княстве Літоўскім уяўляла закрытую супольнасць, якая знаходзілася на самым версе сацыяльнай лесвіцы. Гэтая найбольш заможная і ўплывовая катэгорыя насельніцтва была прадстаўлена магнатамі і буйной шляхтай. Умовы выжывання ў дадзенай суполцы былі дастаткова жорсткімі. Чалавеку трэба было адпавядаць шматлікім патрабаванням, каб лічыцца паўнапраўным яе членам: быць знатным па паходжанні, мець вялізныя грашовыя сродкі і зямельныя ўладанні, высокую дзяржаўную, адміністрацыйную ці вайсковую пасаду і інш.

Магнацка-шляхецкая супольнасць характарызавалася спецыфічнасцю светаўспрымання і наяўнасцю асаблівага стылю жыцця і мыслення, выразным выяўленнем чаго стала культура яе прадстаўнікоў, якая ўяўляла асобнае цэласнае ўтварэнне ўнутры агульнапрынятай культуры Вялікага княства Літоўскага. Яна была адной з чатырох субкультур (рэлігійная, свецка-арыстакратычная, народная і гарадская), якія вылучыў М.С.Каган.

Свецка-арыстакратычная субкультура ўтварылася шляхам трансфармацыі сістэмы каштоўнасцей традыцыйнай культу-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ